УДК 32.001

# ІДЭЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ ЯК АДУКАЦЫЙНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ

**В.У. Галубовіч**
УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт" (Рэспубліка Беларусь, 230008, г. Гродна, вул. Церашковай, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Анатацыя. У артыкуле акцэнтуецца ўвага на роль і месца ідэі незалежнасці ў фармаванні грамадзянскай самасвядомасці студэнтаў.
Ключавыя словы: адукацыя, ідэя, незалежнасць, дзяржава.

# ИДЕЯ ГОСУДАРСТВЕННОЙ НЕЗАВИСИМОСТИ КАК ОБРАЗОВАТЕЛЬНАЯ ЦЕННОСТЬ

**В.В. Голубович**
УО "Гродненский государственный аграрный университет" (Республика Беларусь, 230008, г. Гродно, ул. Терешковой, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Аннотация. В статье акцентируется внимание на роли и месте идеи независимости в формировании гражданского самосознания студентов.
Ключевые слова: образование, идея, независимость, государство.

# THE IDEA OF NATIONAL INDEPENDENCE AS THE EDUCATIONAL VALUE

**V.U. Halubovich**
EI "Grodno State Agrarian University" (Grodno, 230008, 28 Tereshkova st.; e-mail: ggau@ggau.by)

Summary. The article focuses on the role and place of independence idea in the students civil consciousness formation.
Key words: education, idea, independence, state.

Дзяржаўная незалежнасць з'яўляецца бясспрэчнай і самадастатковай каштоўнасцю, бадай, для кожнага народа. Аднак далёка не ва ўсіх краінах яна ўспрымаецца як нешта здабытае ў выніку барацьбы, змагання супраць нацыянальнага прыгнёту. Некаторыя краіны сваім узнікненнем сапраўды не "абавязаныя" нейкаму аднаму дню ў гісторыі, таму, напрыклад, у рэестры дзяржаўных мерапрыемстваў Вялікабрытаніі асобнага свята незалежнасці няма. Паколькі ж большасць сучасных дзяржаў свету з'яўляецца прадуктам распаду каланіяльных імперскіх сістэм, у тым ліку і Беларусь, то



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

момант абвяшчэння (нараджэння) свабоды для іх мае выключную значнасць, а Дзень незалежнасці ў сістэме дзяржаўнай ідэалогіі набывае своеасаблівы сакральны сэнс, становіцца часткай агульнанацыянальнай культуры і важнейшым інструментам фарміравання ідэнтычнасці грамадзян.

Як кожная іншая, ідэалогія беларускай дзяржавы абапіраецца на тыя каштоўнасці, якія маюць вартасць найперш для беларускага народа. Гэта азначае, што для грамадзяніна Беларусі базавай павінна быць айчынная культура як галоўны ідэнтыфікатар народа, як крыніца ідэі незалежнасці, як найбольш моцны ланцужок, што звязвае грамадства з дзяржавай і дазваляе апошняй мець наймацнейшую аргументацыю на карысць абгрунтавання яе існавання. Няма сумненняў, што талерантнасць, шанаванне іншых традыцый з’яўляецца прыкметай цывілізацыйнай спеласці, але далёка не кожны народ можа дазволіць сабе бесклапотнае існаванне, якое ва ўмовах жорсткай палітычнай канкурэнцыі з’яўляецца сінонімам павольнага спаўзання ў нябыт. Адной з галоўных задач беларускай дзяржавы з моманту яе заснавання была і застаецца актыўная абарона менавіта беларускай культуры. Немагчыма не бачыць, што тэхналогіі “мяккай сілы” прыведзеныя ў актыўны рух з боку суседзяў Беларусі ды рэалізуюцца праз разнастайныя структуры. Рэспубліка Беларусь у рэальнасці аточана краінамі, якія імкнуцца тут рэалізаваць свае інтарэсы, у тым ліку праз “укідванне” у інфармацыйную прастору, у тым ліку адукацыйную, разнастайных ідэалагем, накшталт вядомага суседскага “мира”. Але немагчыма выхаваць сапраўднага грамадзяніна і ў лепшым разуменні гэтага слова патрыёта сваёй краіны, калі той будзе нахабна грэбаваць сваёй культурай і безальтэрнатыўна “спажываць” ідэалагічныя канцэрагены, якія распыляюць цэласнасць грамадзянскай самасвядомасці нашага народа.

Калі дзяржава і народ сапраўды абралі шлях самастойнага існавання, то ў іх няма іншай альтэрнатывы, як выкарыстоўваць увесь магчымы арсенал сродкаў для аргументацыі незалежнасці. Трэба прытрымлівацца выразнай дзяржаўніцкай пазіцыі і ў адносінах да свайго мінулага. Гісторыя – гэта тая частка культуры, якую нельга ўспрымаць як састарэлы ідэалагічны арсенал. Яна надалей з’яўляецца мацнейшым інструментам фарміравання палітычнай свядомасці, часам – галоўнай часткай культурнай адметнасці народа. Таму кожны асобны эпізод, які сведчыць пра запатрабаванасць ідэй незалежнасці ў беларускага народа трэба дапасоўваць да сучаснага адукацыйнага працэсу.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Дадзены тэкст, па сутнасці, з'яўляецца рэплікай у асабліва актуальным для 2018 г. дыскурсе пра ролю абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі ў дзяржаўнай ідэалогіі Рэспублікі Беларусь. Выданне 25 сакавіка 1918 г. Трэцяй Устаўной граматы Радай БНР з'яўляецца несумненным палітычным актам, але яшчэ ў большай ступені – вынікам вялікай культурнай працы беларускага народа [1, с. 351-383]. БНР – гэта не палітычная шыльда, а плён працы лепшых прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, тых, хто ствараў і, самае істотнае, стварыў беларускую навуку і адукацыю! Для ілюстрацыі можна прывесці прыклад навукова-арганізатарскай дзейнасці Аркадзя Антонавіча Смоліча (1891-1938 гг.), па сутнасці, першага беларускага міністра асветы ва ўрадзе БНР, пазней вядомага спецыяліста ў галіне эканомікі і сельскай гаспадаркі, прафесара, аднаго з аўтараў першага статута Акадэміі навук БССР [2, с. 369-370]. Не менш выдатнымі варта лічыць дасягненні Івана Мікітавіча Серады (1879-1943 гг.), трэцяга прэм'ера БНР, вядомага спецыяліста ў галіне ветэрынарыі і заатэхніі ў савецкай Беларусі [2, с. 291]. Асобна можна згадаць і пра нашага нацыянальнага прарока – Янку Купалу, які быў уладальнікам пашпарта грамадзяніна БНР.

Беларуская Народная Рэспубліка з'яўляецца старонкай гісторыі беларускага народа, г.зн., часткай яго культуры, старонкай, якая сведчыць пра жаданне нашых продкаў жыць у сваёй краіне, адказаваць за свой лёс і самастойна вызначаць свой шлях. Чым гэта не годны прыклад для новых генерацый беларускіх грамадзян? Ігнараваць мінулае – справа няўдзячная, больш таго – небяспечная. Як паказвае савецкая гісторыя, мінулае ўсё роўна адпомсціць. Таму з гісторыяй БНР не варта змагацца, разумней вылучыць тыя плюсы, якія дае веданне пра яе, і, у першую чаргу, тое, што ўласна прыхільнікі гэтай формы беларускай дзяржаўнасці першымі заявілі пра права беларусаў на сваю дзяржаву, паспрабавалі рэалізаваць ідэю незалежнасці. Апошняе павінны ведаць нашы студэнты, скажаць ці замоўчваць гэты факт нельга, бо на падмане нельга пабудаваць будучыню.

ЛІТАРАТУРА

1. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн.1. Мн., 2011. - С. 351-383.
2. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 6. Кн.1. Мн., 2001.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ